№ 26 (331)
Ліпень 2010 года

# Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года

www.bfk.by

## У нумары:

☞ Рэканструкцыя: *ці стане віртуальнае рэальным?* – *стар. 1 і 7*

☞ Радавод: *Песенкі выбіраюць шлях* – *стар. 5*

☞ Вандроўкі: *дзе вы яшчэ не былі* – *стар. 6*

## На тым тыдні

✓ У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі праходзіць **выстаўка беларускіх народных іконаў** з фонду Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, што каля Мінска. На выстаўцы прадстаўленыя 36 іконаў XIX – пачатку XX стст., сабраныя ў вёсках Падняпроўя, Заходняга і Усходняга Палесся.

Экспазіцыя будзе працаваць да канца верасня. Яна таксама з'яўляецца складнікам цэлай праграмы мастацкіх выставак, якая будзе праходзіць у дні XIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

✓ У музеі рэдкай кнігі Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна **з 23 чэрвеня да 23 ліпеня** праходзіць выстаўка **«Старадрукі гродзенскіх тыпаграфій XVIII стагоддзя».**

У экспазіцыі прадстаўленыя кнігі з гродзенскай тыпаграфіі, якія друкаваліся па заказах старавераў. Гэта важныя для іх старадрукі ідэалагічнага зместу: «Катэхізіс» (1783), «Кніга аб веры» (1785), а таксама «Кветнік» (1787) і «Кніга Кірылы Іерусалімскага» (1786).

Выстаўка арганізаваная ў рамках сумеснага праекта «Гісторыя беларускай кніжнасці» Гомельскай абласной бібліятэкі і Веткаўскага музея народнай творчасці.

✓ **9 ліпеня** ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча адкрылася **выстаўка «Грунвальд за смугою часу»**, прысвечаная 660-годдзю Вітаўта Вялікага і 600-годдзю Вялікай Перамогі пад Грунвальдам (пад Дуброўнай паводле беларускіх летапісаў). Напярэдадні адкрыцця ў дворыку Літаратурнага музея М. Багдановіча адбыўся музычны фэст.

Арганізатарамі выстаўкі сталі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Літаратурны музей Максіма Багдановіча, суполка «Пагоня» Беларускага саюза мастакоў.

Выстаўка будзе экспанавацца да 1 жніўня.




## 600 гадоў нашай Перамозе!



9 ліпеня беларускія рыцары выправіліся на Грунвальдскае поле для ўдзелу ў святкаванні слаўнай Перамогі над Тэўтонскім ордэнам. Апоўдні ад мінскай ратушы яны прайшлі шэсцем да Палаца спорта, дзе іх чакалі аўтобусы, на якіх усе і выправіліся ў Польшчу. Кульмінацыяй урачыстасцяў стане інсцэніроўка бітвы 17 ліпеня на месцы падзеяў

*Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА*

# Ці будзе ў мінчукоў яшчэ адно Траецкае прадмесце?

Вясною 2010 г. адбылося паседжанне Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Нагадаем, што ў гэтую камісію ўваходзяць прадстаўнікі вядучых грамадскіх арганізацый, творчых саюзаў, якія ў сваёй дзейнасці займаюцца вывучэннем гісторыка-культурнай спадчыны, вырашаюць пытанні, звязаныя з яе аховай (сярод іншых у складзе камісіі трэба адзначыць Беларускі фонд культуры, Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускі саюз архітэктараў, Беларускі саюз мастакоў, Беларускі камітэт Міжнароднай Рады па помніках і мясцінах «ІКАМОС», МГА «Гісторыка» і інш.).

Першым па значнасці ў парадку дня было разгледжанае пытанне наконт сітуацыі, што склалася вакол вуліцы Гандлёвай у Мінску. Па сутнасці, гэтаму пытанню і была нададзеная найбольшая ўвага камісіі. Сітуацыя з рэгенерацыяй вуліцы Гандлёвай паўстала пэўны час таму. Практычна завершаная рэкан-струкцыя і рэстаўрацыя – аднаўленне забудовы аднаго боку вуліцы. Што з гэтага атрымалася, можна сёння ўбачыць на ўласныя вочы. Адбылася такая распаўсюджаная з'ява: намаганнямі архітэктараў і будаўнікоў гістарычны цэнтр Мінска атрымаў дамкі «под старину» – муляжы старажытнай забудовы з сучасным дызайнам. Такое аднаўленне становіцца ўсё больш тыповым, калі мы кажам пра рэканструкцыю і рэстаўрацыю помнікаў Беларусі.



*Аэраздымак 1941 г. з накладаннем прапануемага афіцыйнага праекта*

Каб не дапусціць падобнай сітуацыі з забудовай супрацьлеглай часткі вуліцы Гандлёвай, і сабралася камісія дзеля разгляду пытання. Але яшчэ і таму, што зарганізавалася ініцыятыўная група з ліку маладых архітэктараў і мастакоў, якія на працягу некалькіх месяцаў даследавалі сітуацыю з плануемым аднаўленнем забудовы. Праведзеныя імі даследаванні дазволілі зазірнуць у мінулае і пабачыць, як насамрэч выглядала старажытная забудова, што некалі існавала на гэтым месцы. Удзельнікамі ініцыятыўнай групы была зробленая 3D камп'ютэрная мадэль помнікаў гэтага гістарычнага раёна. На аснове архіўных дадзеных была вызначаная і адлюстраваная ўся драўляная і каменная забудова, што некалі існавала, і тым самым была ўнесеная альтэрнатыўная думка ў працэс аднаўлення гістарычнай забудовы вул. Гандлёвай.

*(Заканчэнне на стар. 7)*

Выданні краязнаўцаў краіны

# «З гісторыі палітычных рэпрэсій...»

Нядаўна пабачыла свет чарговая навукова-даследчая праца вядомага краязнаўцы Барыса Бароўскага. Упэўнены: гэтая кніга нікога не пакіне абыякавым. Называецца яна «З гісторыі палітычных рэпрэсій 1920–50-х гадоў на Беларусі». Пад час працы над кнігай аўтар шмат сустракаўся з людзьмі ў розных інстанцыях, было і шмат паездкак, знаходак і нават перашкодаў. А колькі прачытана і апрацавана дакументаў! У кнізе скарыстаныя здымкі і дакументы, прадастаўленыя былымі палітычнымі вязьнямі і іх роднымі. На вокладцы выдання малюнак мастака-маладзечанца Кастуся Харашэвіча «Беларуская Галгофа».

Думаю, варта спыніцца на асобе аўтара. Будучы таленавіты даследчык нарадзіўся ў 1947 годзе на Маладзечаншчыне. Пасля заканчэння школы скончыў аж два факультэты Ваеннай Акадэміі хімічнай абароны ў Маскве, працаваў выкладчыкам Вышэйшага ваеннага вучылішча ў Саратаве. У 1984 годзе абараніў дысертацыю на званне кандыдата хімічных навук. А ў 1986 годзе атрымаў званне дацэнта. Звольніўшыся ў запас у званні палкоўніка, пераехаў жыць і працаваць на Радзіму. Працаваў і дырэктарам школы, і намеснікам старшыні Маладзечанскага гарвыканкама. Цяпер ён – навуковы супрацоўнік Мінскага абласнога краязнаўчага музея.

Шмат дакументальных фактаў аб рэпрэсаваных земляках даў аўтару сведка тых жудасных падзеяў, вядомы не толькі на Маладзечаншчыне, але і далёка за межамі Беларусі, урач-хірург-гематолаг, кандыдат медыцынскіх навук, ураджэнец вёскі Уздрыглавічы былога Крывіцкага (цяпер Маладзечанскага) раёна Франц Іосіфавіч Світо. Ён расказвае аб неабгрунтавана рэпрэсаваных настаўніках Крывіцкай школы, дзе ў той час вучыўся, аб асадніках братах Альковічах, аб малазямельных сялянах Мажэйках, аб родных дзядзьках Вайцяховічах.

Выдумлялі розную хлусню-небываліцу, абы растаптаць, абылгаць жыццё бязвіннага чалавека. Страшна, бо арыштоўвалі і судзілі свае. Прайшло не так і шмат часу, а карані тых «хамелеонаў» засталіся і сёння: злосць, хамства, непавага...




У кнізе ёсць інфармацыя і пра майго дзеда Захара Андрэевіча Станкевіча. Гэта быў просты, шчыры і працавіты беларус. У 1930-я ён быў намеснікам старшыні калгаса «Перамога» ў вёсцы Зацэнне Плешчаніцкага (цяпер Лагойскага) раёна. У 1937 годзе беспадстаўна арыштываны, а ў студзені 1938 года – расстраляны. На руках яго жонкі Праскоўі засталося сямёра дзяцей: тры старэйшыя сыны загінулі ў гады вайны, малодшыя – мой бацька, яго брат і дзве сястры да 1956 года былі дзецьмі «ворага народа». Па сённяшні дзень так і не вядома, дзе расстраляны і пахаваны іх бацька.

У кнізе ёсць успамін аб тых страшных днях вядомага краязнаўцы Маладзечаншчыны Вячаслава Ляшковіча: *«У адну з начэй 1937 года нашую вёску Леснікі, што на Лагойшчыне, зноў "чысцілі". На гэты раз у ліку арыштаваных аказаўся і мой родны дзядзька Мікола. Ён быў калгасным будаўніком. Людзі яго вельмі цанілі за залатыя рукі, дзядзька бываў на сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Ён апынуўся ў ліку "польскіх шпіёнаў", і яго расстралялі»*.

На заканчэнне хачу прывесці ўрывак з водгуку супрацоўнікаў гістфака БДУ на даследаванне Б. Бароўскага: *«Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі – тэма складаная і слаба вывучаная гісторыкамі. У працэсе яе асвятлення даследчыкаў чакае шмат цяжкасцяў. Нягледзячы на гэта, уБ. Бароўскага атрымалася стварыць грунтоўную працу, вартую ўвагі чытача. Яе апублікаванне будзе своечасовым і карысным для нашага грамадства»*.

***Мечыслаў СТАНКЕВІЧ***

# Мясцінамі Ёзаса Булькі

***У пачатку чэрвеня мне пашчасціла быць удзельніцай экскурсіі-вандроўкі, прысвечанай памяці ксяндза Ёзаса Булькі. Экскурсія была вельмі цікавая, і я хацела б падзяліцца сваімі ўражаннямі.***

Экскурсавод (ён жа і кіраўнік паездкі) Генадзь Трафімавіч вельмі цікава распавядаў пра мясціны, якія мы праязджалі. Ад яго мы даведаліся пра шляхецкі род Тышкевічаў, які валодаў маёнткамі ў Астрашыцкім Гарадку, Плешчаніцах ды Лагойску. Два браты Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы былі знакамітымі краязнаўцамі і археолагамі. Канстанцін на аснове ўласных калекцыяў разам з бацькам і братам стварыў Лагойскі музей старажытнасцяў, таксама ён і адзін з заснавальнікаў Віленскага музея старажытнасцяў. Пры Тышкевічах у Плешчаніцах дзейнічаў тэатр, пастаноўкі ў якім былі не горшыя за еўрапейскія. Плешчаніцы яшчэ вядомыя і тым, што тут быў нанесены асноўны ўдар па напалеонаўскай арміі.

Далей мы завіталі ў вёску Пятроўшчына, дзе па ініцыятыве старшыні калгаса быў адкрыты касцёл у прыстасаваным памяшканні былога дзіцячага садка. Там у свой час вёў службу Ё. Булька. А тэрыторыя вакол касцёла нагадвае маленькі райскі сад.

Праязджаючы вёску Радзюкі, мы даведаліся пра знакаміты род Бароўскіх, які вызначыўся ў Крымскай вайне. Адзін з нашчадкаў гэтага роду – Эдвард Бароўскі зараз жыве за мяжой, але час ад часу наведвае землякоў. Наступным прыпынкам быў гарадскі пасёлак Шаркаўшчына, у касцёле якога некалі служыў Ё. Булька.

У вёсцы Асінаў Гарадок знаходзіцца старадаўняя царква, а побач – капліцы, адна з якіх узведзеная на памяць аб загінулых у вайне 1706 года са шведамі, а другая – у вайне 1812 года.

І вядома, самы галоўны прыпынак нашай паездкі – Мосар, «беларускі Версаль». Немагчыма апісаць словамі захапленне, калі бачыш гэтыя вадаёмы з белымі, ружовымі і барвовымі лілеямі, ажурныя масты праз іх, жывапісныя альпійскія горкі, дуб Адама Міцкевіча, і канешне, страусаў, якія бегаюць за агароджай...

Пабачылі мы і найцікавы касцёл у Дунілавічах, дзе праходзіў Альгердаў шлях, і пярліны дойлідства Паазер'я ў Глыбокім – царкву, перапробленую з касцёла і кляштара кармелітаў, і Троіцкі касцёл. Вельмі ўразілі велізарны старажытны парк у Норыцы, вёска Парыж і самае чыстае возера ў Беларусі.

Вярнуўшыся дахаты з добрым настроем і вялікай колькасцю эмоцыяў, мы зразумелі, што добра адпачыць можна не толькі ў якой-небудзь Турцыі, але і ў нашай краіне.

***Людміла КАСЯК, бібліятэкар, г. Мінск***

Працягваецца падпіска на «Краязнаўчую газету» – на ІІ паўгоддзе 2010 года!

| Індывідуальная падпіска | | Ведамасная падпіска | |
|---|---|---|---|
| Індэкс **63320** | | Індэкс **633202** | |
| 1 месяц | 4 500 руб. | 1 месяц | 4 725 руб. |
| 3 месяцы | 13 650 руб. | 3 месяцы | 14 175 руб. |
| 6 месяцаў | 27 300 руб. | 6 месяцаў | 28 350 руб. |

Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь

Ф.СП-1

**АБАНЕМЕНТ** *на газету* **63320** (індэкс выдання)

**Краязнаўчая газета**

Колькасць камплектаў

на 200_ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ПВ | месца | літар

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету **63320** (індэкс выдання)

**Краязнаўчая газета**

| Кошт | падпіскі | ________руб. | Колькасць камплектаў |
|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________руб. | |

на 200_ год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

# «Ваярская» прэзентацыя

***Сёлета 8 ліпеня ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося адкрыццё гісторыка-культурнага праекта «Грунвальд-600», стартавымі мерапрыемствамі якога сталі прэзентацыя паштовак «Грунвальдская бітва ў выявах: па матэрыялах з фондаў НББ» і прэзентацыя кнігі Юрыя Бохана «Ваяры Грунвальдскай бітвы». Мерапрыемства, а калі больш дакладна, папярэдняя яго частка праходзіла ў музычным суправаджэнні струннага квартэта «Капрыз», які некуды знік адразу з пачаткам прэзентацыі.***



Ю. Бохан

Асноўная частка імпрэзы пачалася з прагляду інфармацыйнага фільма пра Грунвальдскую бітву, працягнулася ўступнымі словамі дырэктара НББ Р. Матульскага. Станоўча адзначыў кнігу прадстаўнік Міністэрства інфармацыі Беларусі В. Рагалевіч, выступіла таксама в.а. дырэктара выдавецтва «Беларусь» В. Пінчук.

Ю. Бохан падзякаваў усім, хто яму дапамагаў, і, як ні дзіўна, папрасіў прабачэння ў сваёй жонкі і сям'і за няўвагу да іх пад час працы над кнігай. Выступленні ўдзельнікаў суправаджалі выявы, малюнкі, гравюры, прысвечаныя Грунвальдскай бітве, якія ўвесь час адлюстроўваліся на плазменным экране. Пад час прэзентацыі можна было набыць набор паштовак і кнігу, але не шмат людзей чамусьці імкнуліся гэта зрабіць.

***Наста КАДЫГРЫБ***

# Ліст аднаго палачаніна

У «Краязнаўчай газеце» (№ 23 (328) за чэрвень 2010 года) быў надрукаваны артыкул Валерыі Закрэўскай «Да канца не ацэнены ўклад», прысвечаны 110-годдзю Івана Дэйніса (1900–1985), полацкага краязнаўцы савецкага часу. Аўтар звярнула ўвагу на недасканалую вывучанасць укладу Івана Пятровіча ў краязнаўства Беларусі і Полацка. І з гэтым нельга не пагадзіцца. У 2005 годзе я таксама звяртала ўвагу на гэта ж у мясцовай газеце «Полацкі веснік» (№№ 4–5) у артыкуле «Улюбёны ў полацкую даўніну», прысвечаным 105-годдзю краязнаўцы. Але ж з цягам часу вывучэнне асобы Івана Дэйніса і яго краязнаўчых працаў толькі больш пагоршылася. Страта з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка арыгінала рукапісу «Полоцк в ХХ веке»« і адсутнасць крытычнага падыходу да астатніх працаў савецкага краязнаўцы прывялі да агульнага «ўвядзення ў навуковае абарачэнне» шматлікіх памылак у гісторыі Полацка. Перш – у гісторыю пачатковага перыяду краязнаўчага руху.

З артыкула ў артыкул (у тым ліку і В. Закрэўскай) пераходзяць звесткі аб тым, як Іван Дэйніс «узначальваў» полацкае краязнаўчае таварыства ў 1925 годзе, быў старшынёй праўлення, кіраваў «вучнёўскім гуртком» ці прымаў удзел у раскрыцці мошчаў Ефрасінні Полацкай. Пералічаныя факты робяць больш значным асобу Івана Дэйніса ў 1920-я гады. Між тым, архіўныя дакументы і надрукаваныя раней іншыя артыкулы (у тым ліку ў «Краязнаўчай газеце» ў кастрычніку 2006 года «Пятро Дэйніс, або Як пачэсна і цяжка быць лідэрам мясцовых краязнаўцаў») сведчаць аб іншым. У 1920-я гады юнак Іван Дэйніс разам з сябрамі-аднагодкамі актыўна працаваў у студэнцкім гуртку пад кіраўніцтвам свайго бацькі Пятра Язэпавіча Дэйніса (1873–1941). І менавіта Пятро Дэйніс быў моцнай аўтарытэтнай фігурай у культурным жыцці Полацка ў 1920-я гады. Ён кіраваў краязнаўчымі гурткамі і значнымі дзяржаўнымі камісіямі, уваходзіў у праўленне Краязнаўчага таварыства, створанага ў 1924 годзе на чале з І.П. Лубоўскім (11.11.1891 – 30.12.1937). Пятро Язэпавіч праводзіў раскрыццё мошчаў хрысціянскіх святых у Полацку. Між тым, асоба Пятра Дэйніса засталася па-за ўвагай краязнаўцаў і даследчыкаў гісторыі Полацка і Полаччыны. Нават у даведніку М. Піваварa «Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г.» біяграфічныя звесткі Івана Дэйніса аб'ядноўваюцца з біяграфічнымі звесткамі Пятра, пра якога няма ў даведніку ніякай інфармацыі. У артыкуле В.Закрэўскай пра Івана Дэйніса пададзены фотаздымак Пятра Дэйніса.

Іван Дэйніс дапамагаў бацьку і некалькі месяцаў выконваў працу сакратара ў Полацкім краязнаўчым таварыстве (магчыма, пры гэтым атрымліваў дадатковы заробак), пакуль не паехаў вучыцца ў БДУ ў жніўні 1925 года. Але ж яшчэ раз трэба падкрэсліць, што самастойная краязнаўчая дзейнасць Івана Дэйніса прыпадае больш на пасляваенны час. Ён адносіцца да краязнаўцаў з іншымі задачамі дзейнасці, чым тыя, што былі ў краязнаўцаў 1920-х гадоў, да якіх, безумоўна, адносіцца Пятро Дэйніс.

У 1967 годзе да 50-годдзя «Вялікай кастрычніцкай рэвалюцыі» Іван Дэйніс напісаў вялікую (433 старонкі аўтарскай нумарацыі) працу «Полацк у ХХ стагоддзі», у якой пакінуў шмат дакладных і недакладных звестак пра розныя моманты полацкай гісторыі. У сваёй працы ён выкрасліў імёны асобаў, якія адыгрывалі значную ролю ў культурным жыцці горада, але былі рэпрэсаваныя і лічыліся «ворагамі народа» ў яго час. Так замест рэпрэсаванага старшыні Полацкага краязнаўчага таварыства І.П. Лубоўскага больш значную ролю ў ім стаў адыгрываць сакратар Іван Дэйніс. Увогуле, у працы не ўзгадваецца першы загадчык полацкага Акруговага краязнаўчага музея Сямён Брэскі (1898 – пасля 1938), рэпрэсаваны ў 1928 годзе. Некаторыя гістарычныя падзеі Іван Дэйніс абыйшоў увогуле. Да таго ж шмат памылак у тэкст было ўнесена тэхнічным сакратаром (альбо цэнзарам), які рабіў машынапісныя варыянты тэксту рукапісу (а менавіта толькі машынапісныя варыянты пра Полацк ХХ стагоддзя засталіся ў фондах музея).

Усё гэта прывяло да поўнай блытаніны ў імёнах, недакладнасці гістарычных падзеяў і нават дацыроўкі стварэння Краязнаўчага таварыства ў Полацку, якое пачалі лічыць з 1925 года (замест 1924). Пра актыўную асветніцкую дзейнасць свайго бацькі Іван таксама дае не шмат звестак. Ён нават не пакінуў асобнага фотапартрэта свайго бацькі. Вучоны-археолаг, былы дырэктар вышэйшага пачатковага вучылішча імя П.Х. Вітгенштэйна (1905–1918), дырэктар найлепшай першай савецкай школы ў Полацку (1919–1926) краязнаўца Пятро Дэйніс быў у цэнтры ўсіх культурных падзеяў горада ў 1920-я гады. Менавіта ён праводзіў актыўную працу па арганізацыі краязнаўчага руху ў Полацкай акрузе, рыхтаваў праект рэстаўрацыі царквы Барыса-Глебскага манастыра, вывучаў культурна-археалагічныя помнікі Полаччыны і захаваў мошчы святой Ефрасінні Полацкай і пакутніка Андрэя Баболі ў 1922 годзе ад абвяшчэння іх «фальсіфікацыяй царквы». У вайніковым дакуменце праведзенай бальшавіцкай уладай «экспертызы» навукоўцам Пятром Дэйнісам мошчы былі аб'яўленыя муміфікаванымі целам, таму былі выратаваныя ад знішчэння. У хуткім часе мошчы Ефрасінні Полацкай былі змешчаныя ў Віцебскім музеі, а мошчы Андрэя Баболі перададзеныя Ватыкану.

Чаму ж засталіся невядомымі некаторыя старонкі жыцця Пятра Дэйніса? І чаму ён раптоўна быў вымушаны пакінуць Полацк у 1926 годзе і пераехаць у Гомель?

Яго пераезд быў нечаканым і, магчыма, быў звязаны «з лістом аднаго палачаніна» ў газетах «Звезда» і «Савецкая Беларусь» за 1926 год. Артыкул «Вражда из-за языка» быў надрукаваны ад імя «белорусса» з Полацка, які не жадаў мірыцца з



*Пятро Дэйніс з сынам Іванам і дачкой, 1926 год*

уводам беларускай мовы ва ўстановах адукацыі, дзяржаўных установах. Аўтар лічыў неперспектыўным выкарыстоўванне беларускай мовы пры выкладанні тэхнічных дысцыплінаў, лічыў памылковым адмову ад вывучэння «русского языка». Асабісты погляд аўтара выклікаў шырокую дыскусію ва ўсіх колах грамадства таго часу, а «палачанін-белорусс» быў абвешчаны *«паклоньнікам мошчаў Ефросініі Полацкай»* і *«адрыжкай старых часоў»*. А ці не быў звязаны гэты артыкул з Пятром Дэйнісам? Мне гэта дакладна невядома, але ж згодна з дакументам, 1926-ты навучальны год Пятро Дэйніс пачне ўжо ў Гомелі, а Іван Дэйніс – у Мінску. Відавочна, што і гэтая справа ў дачыненні да бацькі не дазволіла сыну Івану ў савецкі час даваць больш дасканалую гістарычную інфармацыю аб людзях і падзеях роднага горада, які ён, безумоўна, любіў і жадаў унесці свой важны ўклад у яго гісторыю.

*Наталля СЯРГЕЕНКА,*
*спецыяліст па турызме,*
*г. Полацк*

*Пасля прачытання*

## «Яўхім Карскі на Клеччыне» і Мікалай Чудоўскі

***Нядаўна прачытала артыкул А. Блінца «Яўхім Карскі на Клеччыне» («КГ», № 39, кастрычнік 2009 г.), дзе згадваецца і выкладчык Слуцкай гімназіі Мікалай Чудоўскі. Займаючыся гісторыяй клімату і гідраметдаследаванняў на тэрыторыі Беларусі, я сабрала вялікі матэрыял аб многіх, здаецца, шэраговых назіральніках за надвор'ем, якія працавалі зусім бясплатна і нястомна кожны дзень без выхадных звыш сваіх звычайных абавязкаў. Але многія з назіральнікаў аказаліся знакамітымі асобамі для свайго часу. Сярод іх быў і Мікалай Чудоўскі. Біяграфічныя звесткі з майго збору (якія я і прапаную чытачам «Краязнаўчай газеты») кароткія, але адлюстроўваюць шматгранную дзейнасць гэтага чалавека. Дзякуй А. Блінцу за яго дадатковыя звесткі.***

Чудоўскі Мікалай Іванавіч – назіральнік метэастанцыі Слуцк з 1874 па 1896 гады. Матэрыялы назіранняў штомесяц высылаліся ў Галоўную Геафізічную абсерваторыю (ГФА) у Пецярбургу. У жніўні 1887 года ўдзельнічаў у назіраннях за сонечным зацьменнем па ўказанні ГФА.

Цікавіўся таксама краязнаўствам, у прыватнасці – мясцовымі гаворкамі. Надрукаваў у «Русском филологическом вестнике» артыкул «Материалы для изучения белорусских говоров. Слуцкий говор», які прыцягнуў увагу вядомага навукоўца Я. Карскага.

Нарадзіўся ў Наваградскім павеце. Атрымаў годнасць кандыдата фізікі Харкаўскага ўніверсітэта. Быў настаўнікам матэматыкі і фізікі ў Слуцкай гімназіі. Выкладаў таксама ў Слуцкім жаночым пансіёне. На дзяржаўнай службе быў з 1871 года, у Слуцкай гімназіі – з 11 лютага 1874 года. У гэты час дырэктарам гімназіі быў Мацвей Васільевіч Фурсаў, выкладчык геаграфіі, лацінскай мовы і славеснасці. Пад яговым кіраўніцтвам у гімназіі ў снежні 1874 года была арганізаваная гарадская метэастанцыя. Сам Фурсаў цікавіўся краязнаўствам і гісторыяй, напісаў падручнік па матэматыцы. Пазней быў дырэктарам Магілёўскай гімназіі і рэдактарам «Могилёвских губернских ведомостей».

М. Чудоўскі ў 1878 годзе меў чын калежскага асэсара (службоўца 8 класа), а ў 1896-м – ужо стацкага дарадцы. Быў жанаты. Заробак меў даволі высокі – 900 рублёў, надбаўка за ўрокі складала 540 рублёў, класнае настаўніцтва – 160 рублёў. Меў званне «заслужанага выкладчыка». Працаваў у гімназіі да 10 верасня 1896 года.

*Раіса АЎЧЫННІКАВА,*
*сапраўдны член Геаграфічнага таварыства*




*(Заканчэнне. Пачатак у № 25)*

# Бітва народаў



Вітаўт ведаў, што яшчэ пры князю Віценю, які стаў у 1293 годзе вялікім князем Вялікага Княства Літоўскага, быў устаноўлены дзяржаўны сімвал-штандар «Пагоня». Чырвонае палотнішча з белым срэбным вершнікам на белым баявым кані. Рыцар у белых рыцарскіх даспехах, у шаломе з пер'ямі, з узнятым мячом, шасціканцовым крыжам – сімвалам сонца – на шчыце. Яшчэ з язычніцкіх часоў, да прыняцця хрысціянства, прашчуры ўшаноўвалі і пакланяліся сонцу – крыніцы жыцця – і рабілі яго розныя вывы. «Пагоня» праз многія бітвы і гады стала «Святой» – гонарам і сумленнем; яна зрабілася пераемніцай старажытнага полацкага святога – сімвалам воіна-збавіцеля на кані ў махрастым крузе.

Вітаўт дакрануўся вялікімі шпорамі да мускулістых белых бакоў свайго каня; той рвануў і ўзнёс вершніка на пагорак. За ім узнёсся і воін з «Святою Пагоняй». Войска не выгуквала баявых клічаў. Гэта быў не парад, а хвіліна перад боем. Удалечыні былі відаць чужынскія калоны пад крыжамі ордэнскіх штандараў.

Беларуска-ліцвінскія воі ў каторы раз былі ўражаныя падабенствам свайго князя да вывы на «Святой Пагоні». У наспелай цішыні выразна прагучала толькі адно яго слова:

– Літва!

Меч князя імкліва паказаў у бок ворага.

– Літва!!!

Тысячы коней узняліся на дыбы ад гэтага слова, уся грозная лавіна імгненна ашчацінілася зброяй.

Конніца панеслася на ворага з пранізлівым шматгалосым крыкам.

Малады разведчык на сваім маларослым тарпане нёсся ў цэнтры лавіны. Конніца імчала на воўчыя ямы-пасткі. Так загадаў вялікі князь Вітаўт, а ён ад трох разведчыкаў ведаў пра гэтыя пасткі. Наперад, разам з усімі – наперад! Воіны спадзяваліся на сваіх коней, спадзяваліся, што тарпаны пранясуцца паміж ямаў, усё больш ахопленыя прагай бою. Спыніць іх зараз магла толькі смерць.

Тэўтонцы ўзнялі дзіды, іх рыцары нацягнулі цяжкія лукі.

Воўчыя ямы, лукі і дзіды зрабілі сваю справу. Лавіна конніцы Вітаўта прыпынілася, затапталася на месцы. Стрэлы працягвалі касіць коннікаў. Разведчык бачыў, як падалі пакалечаныя коні і воіны, запаўняючы воўчыя ямы. Ацалелыя ж аб'язджалі ямы ды ўсё імчалі, сігалі наперад.

Пасеклі слабыя шэрагі лёгкіх нямецкіх пехацінцаў. За воўчымі ямамі іх сустрэла закутая ў панцыры рыцарская цяжкая конніца. Выконваючы загад магістра, яна растаптала сваю пяхоту лучнікаў і кінулася ліквідаваць прарыў.

Вітаўт назіраў за боем з пагорка.

– Час настаў, – сказаў ён сабе. – Патрымайся князь Ягайла, – падаў знак світе. Забілі барабаны, затрубілі трубы – вершнікі павярнулі коней. Вялікі князь без хвалявання пазіраў на адступленне сваіх войскаў. Ён узняў каня на дыбкі і віхрам памчаў да лесу. Вітаўт выводзіў свае палкі з бою, адыходзіў з-пад Грунвальда.

Магістр Ульрых фон Юнгінген кінуў у бой пяхоту. Не стала літоўскай конніцы, цяпер яны па частках даб'юць астатніх. Яны перамогуць.

Палякі і палкі мсціслаўскага князя ўступілі ў смяротную сечу з рыцарамі.

Адступае адзін фланг, другі. І сталі цэнтрам бітвы тры палкі мсціслаўскага князя. Стаялі воіны, як укапаныя. Падалі і біліся параненыя. Ніхто не прасіў літасці, ніхто не ўцякаў. Тут падрахункі ішлі на карысць крыжакоў. Мсціслаўцы сцякалі крывёю, але й іх мячы ўволю пілі варожую кроў.

Адзін полк рыцараў знішчылі цалкам. Два іншыя яшчэ трымаліся.

Радзелі і галоўныя сілы немцаў.

Магістра гэта не хвалявала. Ён разумеў: пасля адыходу Вітаўта, колькі б ён ні цягнуўся, перамога дастанецца яму. Магістр загадаў адвесці войскі, перастроіць. Выканаўшы яго загад, крыжакі ўдарылі з новай сілай. Не стала і другога палка мсціслаўцаў.

Усё гучней несліся над полем воклічы крыжакоў. «Перамога!» – і магістр, прыроджаны воін і палкаводзец, адчуў: час наспеў.

— У атаку цяжкую конніцу! – загадаў Ульрых фон Юнгінген.

Магістр сам павёў у цэнтр сечы найлепшых адборных рыцараў.

«Зброя, ты адзінае, што можа цяпер пастаяць за праўду, справядлівасць і Бога, дык не выпадзі з рук, пакуль я жывы, пакуль маю сілы!» – так моляцца славяне. Гэтаксама (амаль гэтаксама) просяць Усявышняга немцы ды іхнія хаўруснікі. Перамогі над нячыстымі, паганцамі, перамогі над ворагам, і ў яго землях! Перамогі!

Ніхто не хацеў саступаць, і дрыжэла зямля, і падалі людзі паверх коней. Працаўнікі буйнымі снапамі клаліся пад булатам адзін пры адным.

«Перамогі!» – прасілі вусны на розных мовах. І не стала дня, і цёмная ноч прасцірала крылле пад яркімі промнямі сонца.

Страх і жах, удары.

Чуваць баявыя крыкі тэўтонцаў.

І не чуваць воклічаў войска Ягайлы, і дужэюць рукі немцаў. І ўсё ж падалі голас воі князя і караля.

Вітаўт не дарэмна прудзіў дарагімі сэрцу воінамі ямы-засады. Ён чакаў і тады, калі рвалася струна перамогі, калі толькі мсціслаўцы стаялі на месцы, грудзьмі сваімі памагалі перагрупавацца сябрам і паплечнікам.

Конніца Вялікага княства – меткія стрэлы, хваля стрэлаў, стральба на скаку, навучаныя коні самі хапаюць ворага, сцягваюць з сядла, цяжкія ўдары доўгага, як у пехацінца, мяча-шаблі, якім можна сячы і калоць. Вялікалітоўская конніца-пагоня! – гэта ты расхінула межы ад Балтыкі да Чарнамор'я...

Трашчыць лес, плёхкае балота. Нячысцікамі, ваўкалакамі вылятаюць коннікі.

Магістр не мог адступіць. Развярнуўшы цяжкую конніцу і ўсе рэзервы, ён рушыў насустрач варожай лавіне. Гудзе зямля.

Цяпер ужо на шляху конніцы не было воўчых ямаў-засадаў, не было лучнікаў і кідальнікаў дзідаў. Нямецкія рыцары ўдарыліся аб лавіну, як хваля аб бераг. Нядоўга паміж кальчугаў і чорных постацяў ліцвінскіх вершнікаў відneліся белыя плашчы з чырвонымі крыжамі.

Лязгат дзідаў і мячоў, удары конскіх капытоў, крыкі параненых і раздушаных. Працяглы гул.

Малады разведчык на маленькім тарпане ўсё бліжэй прабіваецца да магістра. Сціснуты чужынскімі коньмі, хрыпіць і, здаецца, вось-вось паваліцца малы тарпан. Тарпан кусае вялікіх коней. Уладная рука воіна сячэ рыцараў і зноў кіруе тарпана ў самую гушчу бітвы. Але вось раскалоўся шлем на галаве, русыя валасы рассыпаліся па плячах, з мядзведжай шкуры нерухома звісаюць абломкі варожых стрэлаў. Вочы яшчэ гараць агнём, як у рысі, але ўдар мяча ўжо не ўдар перуна.

Да магістра далёка, да яго не могуць прабіцца дзесяткі іншых адважных воінаў. Малады русіч-ліцвін гэтага ўжо не бачыць.

Яго меч яшчэ сышоўся з мячом сустрэтага рыцара. Той таксама паранены. Не варушыцца адна рука. На момант сустрэліся іх раз'юшаныя погляды. Усю горыч паразы ўкладвае ва ўдар мяча рыцар. Усю нянавісць да заваёўнікаў, боль па загінулых сябрах укладвае ва ўдар малады ліцвін. Вось яго меч нарэшце прайшоўся па рыцарскім шаломе. Той з трэскам зляцеў, адкінуліся чорныя доўгія валасы.

У наступны момант ліцвінскі меч адсек валасы крыжака. У тое ж імгненне быў рассечаны і чэрап магістра Ульрыха фон Юнгінгена.

Было гэта 15 ліпеня 1410 года. Сорак тысячаў нямецкіх крыжакоў былі забітыя, пятнаццаць тысячаў узятыя ў палон.

Адсвяткаваўшы перамогу, войска князя Вітаўта вярнулася дамоў. Малады воін вылечыўся, шмат аб'ездзіў, выбіраючы ўтульную мясціну для селішча. Багата прыгожых палянаў, чыстых рэчак і люстраных азёраў сустрэлася на ягоным шляху, ды аблюбаваў ён мясціну, блізкую да месца нараджэння, спадабаўся ягонай жонцы менавіта гэты сонечны пагорак на беразе крынічнай рачулкі. Наўкола стаяў чысты бор, на сонцы ён здаваўся асабліва зялёным і свежым. На ўскрайку такога ж лесу была бітва, на ўскрайку гэтага лесу ён пасяліцца. А бурштыну жонцы ён так і не сабраў на беразе мора. Было не да таго.

Тут, на зямлі продкаў, паставіў ён хату, збудаваў стайню для неразлучнага тарпана.

Потым вакол яго сяліліся сябры па войску.

Возера і селішча назвалі Грунвальд, каб увекавечыць Вялікую Бітву Народаў.

**...Вёска Грунвальд[1] ёсць у Пастаўскім раёне да сённяшняга дня.**

*Генадзь ЛАНЕЎСКІ (Паводле кнігі «Сыны і пасынкі Беларусі». Мінск, 1996)*

[1] Цяпер вядомая пад назвамі Грунвальды, Грынвальд. – «КГ».




# Песенкі: час не выбіраюць – выбіраюць шлях

*Беларусь мая несмяротная, кветка белая, маці родная,*
*усёй істотай сваёй табе шчасця хачу...*
*Л. Радзевіч*

*Давайце задумаемся: што было самым значным для нашых продкаў, за што аддавалі жыцці нашыя дзяды і прадзеды? Мяне заўсёды цікавілі беларусы: мая сям'я – цэлы мікракосмас, бо кожны чалавек у радаводзе – асобная планета, непаўторная і прыцягальная ў сваёй індывідуальнасці і жыццёвым лёсе. Нават мае бацькі, якіх я добра ведаю, такія родныя і блізкія – бываюць далёкімі, як зоркі ў начным небе. Калі ўлічыць, што за сто гадоў мяняецца прыкладна тры пакаленні, то я атрымаў у спадчыну па самых малых падліках ад дзесяці пакаленняў – 1024 прарodзічаў! Як выказаць удзячнасць усім людзям, якія па генах перадалі мне жыццё? У сваёй працы я паспрабаваў даведацца пра іх, уявіць эпоху, калі яны жылі, гістарычныя ўмовы і параўнаць іх мары са сваімі.*


Аляксандр Ігнатавіч Трыгубовіч

## Паходжанне майго роду

Цяжка апісваць гісторыю паходжання майго роду, бо толькі працуючы над радаводам, я асэнсаваў сябе часткаю на радавым дрэве. Усе продкі – прадстаўнікі не аднога роду, розныя па нацыянальным паходжанні, сацыяльным стане, веравызнанні, культурных традыцыях, сямейных звычаях, але ўсе яны ў розны час аказваліся ў вёсцы Ляды Чэрвеньскага раёна, дзе перапляталіся іх жыццёвыя шляхі-лёсы. Таму гэтую вёску я магу лічыць сваім родным куточкам.

Ужо з прозвішчаў сваякоў зразумела, што мой род шматнацыянальны. Трыгубовічы – беларусы, паходзяць з Капыльскага раёна, дзе ёсць цэлая вёска людзей з такім прозвішчам. Таксама да беларускіх родаў адносілі сябе свядома Пальманоўскія (яны мелі землі каля Старых Дарог) і Бузаноўскія (Міншчына). Песенкі вядуць свой пачатак з Расіі – у вёсцы Дабрадзееўка, што на Браншчыне, да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС кожны другі жыхар меў такое ж прозвішча, што і я. На жаль, з-за высокай ступені забруджанасці радыенуклідамі жыхары вёскі былі пераселеныя. Сёння тут зона адчужэння. Рускія паводле паходжання і Феакціставы, якія з'явіліся ў Беларусі ў часы царкоўнага расколу з-за пераследу ўладаў. Доўгі час яны жылі ў Ветцы, што на Гомельшчыне, якая тады была цэнтрам стараверства. З Веткі былі і Новічы, а адкуль яны з'явіліся тут – невядома. Гурэцкія – род польскага паходжання, як і Ждановічы, якія мелі гербы, характэрныя для польскіх земляў.

Герб Ждановічаў – Ястэржэмбец – адзін з самых старажытных у Польшчы, аб чым я знайшоў звесткі ў інтэрнэце, і вядзе свой пачатак ад часоў язычніцтва, калі ў гербе продкаў была выява ястраба. А пры Баляславе Храбрым (X ст.) на ім з'яўляюцца падкова і крыж як узнагарода ад караля за службу (пра гэта ёсць паданне). Рознымі паводле сацыяльнага стану былі мае продкі. Песенкі, Трыгубовічы, Феакціставы былі сялянамі, чаго ніколі не саромеліся. Род Пальманоўскіх так збяднеў, што хаця і лічыўся шляхецкім, але мала адрозніваўся ад мяшчанскага стану. Бузаноўскія, Гурэцкія, Ждановічы былі дваранамі, але пасля рэвалюцыйных падзеяў 1917 года сталі простымі сялянамі.



Герб, якім карысталіся Ждановічы

Немагчыма дакладна вызначыць, які з родаў больш старажытны. А самыя даўнія звесткі аб існаванні роду тычацца Ждановічаў і прасочваюцца з 1705 года дакументальна (я маю «Свидетельство Департамента геральдии правительствующего Сената Ждановичу К.А., С.-Петербург, 12.08.1894 г.»).

Я склаў свой радавод з 1705 года па сённяшні дзень. Асобна змясціў звесткі аб гадах жыцця, сацыяльным стане і месцы жыхарства 46 сваіх продкаў па прамой лініі (без уліку стрыечных сваякоў).



Герб, якім карысталіся Гурэцкія

Лініяй Трыгубовічаў цікавіўся мой прадзед – Аляксандр Ігнатавіч Трыгубовіч. Ён, на жаль, памёр у 2000 годзе, але пакінуў блакнот з сабранымі звесткамі, які аддала мне стрыечная бабуля Ала Аляксандраўна.

Звесткі пра род Бузаноўскіх збіраў Юліян Бузаноўскі, якому ў 1975-м было 75 гадоў. Жыў ён у Навасібірску, адтуль прыслаў нам фотаздымак Пятра Антонавіча Бузаноўскага, а таксама радавод бліжэйшых сваякоў. З яго я даведаўся, што вядомы мастак Казімір Малевіч з'яўляецца маім далёкім сваяком: ён быў сынам унука Пятра Антонавіча Бузаноўскага.

Дзякуючы дакументам, што захаваліся, я прасачыў свой род па лініі Ждановічаў па мужчынскай лініі да 14-га калена.

Мала вядома мне пра род Песенкаў. Многія цяпер жывуць за межамі Беларусі на прасторах былога СССР, мы радка сустракаемся. Але пры сустрэчы я займаюся зборам інфармацыі, каб запоўніць «белыя плямы» свайго радаводу.

## Традыцыі маёй сям'і

Самая старая традыцыя – перадача з пакалення ў пакаленне па мужчынскай лініі старажытнай іконы, якая належыць роду Феакціставых. З якога часу яна належыць – невядома, але ж ці ў гэтым яе каштоўнасць? Ведаю, што яна прывезеная маімі продкамі-старaверамі яшчэ з Расіі. І дакладна вядома, што апошнія сто гадоў (а можа, і больш) яна перажывае ўсе ўзлёты і падзенні разам з Феакціставымі. Цяпер яна знаходзіцца ў майго дзядулі Леаніда Міхайлавіча. А паколькі ў яго няма сыноў, то ікона будзе перададзеная старэйшаму ўнуку – гэта значыць мне – Аляксандру Песенку.


Фрагмент іконы Феакціставых

Мая сям'я рознаканфесійная: Ждановічы, Трыгубовічы, Гурэцкія, Пальманоўскія, Бузаноўскія вызнавалі каталіцызм, Феакціставы, Аляновічы, Песенкі, Новічы, Шылабоды былі праваслаўныя. Рэлігійная талерантнасць, характэрная для беларусаў, заўсёды была ўласцівая маёй сям'і. Як сямейную традыцыю я ўспрымаю святкаванне і каталіцкіх, і праваслаўных святаў, наведванне і касцёла, і царквы. У маёй сям'і ніколі не паўставала пытанне, чыя вера правільная, бо кожны паважаў веравызнанне іншага.

Сваю сямейную традыцыю стварыў мой прадзед Аляксандр Ігнатавіч Трыгубовіч. Ён штогод віншаваў з надыходам Новага года сваякоў па 60-ці адрасах. Паштоўкі набываў і падпісваў загадзя, укладваючы ў кожны канверт частку свайго сэрца. Калі лісты ў далёкую Сібір ці Казахстан не даходзілі ці спазняліся з-за святочнай перагрузкі пошты, сваякі званілі і хваляваліся: ці не захварэў Аляксандр Ігнатавіч? Сямейнай традыцыяй было святкаванне Дня Перамогі. Мы ўсе збіраліся ў прадзеда Сашы, каб павіншаваць яго і абавязкова паспяваць песні вайны.

А сямейная традыцыя навучання дзяцей праз аплікацыі і мастацкую творчасць прывяла маю стрыечную бабулю А.А. Ганчарову (у дзявоцтве Трыгубовіч) да стварэння новай адукацыйна-выхаваўчай тэхналогіі «Нажнічкі-чараўнічкі», якая і сёння паспяхова выкарыстоўваецца ў дашкольных навучальных установах і пачатковай школе. Непасрэдна ў маёй сям'і існуюць свае традыцыі. Мы вельмі любім падарожнічаць. Калі фінансы і вольны час бацькоў дазваляюць, мы едзем турыстамі ў іншыя краіны. Але з няменшым захапленнем мы падарожнічаем па Беларусі і нават па роднай Міншчыне.

*Аляксандр ПЕСЕНКА,*
*вучань СШ № 60 г. Мінска*
*(Кіраўнікі – настаўнікі гісторыі А. Г. Хахлова, Л. В. Крыловіч)*


А.А. Ганчарова з унукамі, 1995 год

*Падзялюся досведам*

# У гасцях у роднай Беларусі

***Усім вядомая песня, дзе ёсць словы «Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць». Сапраўды, мы ўсе імкнемся пад час летняга адпачынку выехаць за мяжу, а родную Беларусь збольшага проста не ведаем. Не ведаем яе турыстычных маршрутаў, не заўважаем яе прыгожых краявідаў, не цікавімся яе гісторыяй. Часам каб палюбіць – трэба проста расплюшчыць вочы і... пабываць у роднай Беларусі.***

Мора, сонца і спякота ўлетку – гэта, не спрачаюся, цуд, але нічога не заменіць добры турыстычны адпачынак на беларускіх азёрах: начлег у намётах, песні пад гітару каля вогнішча, незвычайную прыгажосць захадаў сонца, пяшчотныя світанкі... І скажыце – нашто ехаць на Мальдывы, у Крым ці Егіпет, калі ў нас можна адпачыць з душой ды карысцю для яе. А хто будзе казаць, што такі расклад картаў яму не падабаецца, то ён проста добра і з густам не адпачываў. Тым больш, што азёрная рэлаксацыя можа стацца для вас паездкай выхаднога дня, такой распаўсюджанай сярод турфірмаў.

Краязнаўчыя і турыстычныя паездкі па роднай Беларусі з сябрамі я практыкую крыху больш за год. За гэты час мы аб'ездзілі шмат мясцінаў роднай Віцебшчыны. Адным з апошніх незабыўных прыпынкаў стала для нас невядомая дагэтуль Ушацкая зямля – з яе азёрамі, не горшымі за браслаўскія, і цудоўнай гістарычнай спадчынай.

А пачалося ўсё з возера Атолава, што непадалёк ад вёскі Загор'е і ўваходзіць ва Ушацкую групу азёраў. Яно ўражвае сваімі высокімі берагамі і цішынёю. Найлепшае месца для сустрэчы з маці-прыродай. Сунічныя паляны, смаўжы-прыгажуны (ні ў якім разе не для ежы) і поўныя місы рыбы. Дарэчы, Ушаччына проста створаная для заўзятых аматараў лоўлі печкуроў. На возеры Атолава сем астравоў, з месца нашага прыпынку былі бачныя два, яны і надавалі прыгажосць таму краявіду. Нам пашчасціла на цёплую ноч, у цішы якой мы назіралі за чароўным яблыкам поўні. Ранак сустрэў нас перад дажджлівым сонейкам з адценнем прыпаркі, але мы паспелі паснедаць варанай бульбачкай і смажанымі карасікамі з ранішняга ўлову. У турысцкіх умовах такі сняданак – проста смаката.

Нядзельны дождж не азмрочыў нашага настрою. Сабраўшы намёты, мы падумалі: «Быць на Ушаччыне і не заехаць ва Ушачы – немагчыма!» – і накіраваліся ў раённы цэнтр. З гісторыі вядома, што ў часы Рэчы Паспалітай горад збіраў павятовыя сеймікі, а ў складзе Расійскай імперыі быў часткай Полацкага ваяводства і Пскоўскай губерні. Нездарма ушацкі касцёл фундаваў полацкі падваявода Геранім Жаба. Сёння касцёл Св. Лаўрэна з чырвонай цэглы – прыгожы, як і раней, хаця аднаўлены толькі ў 2004 годзе і мае крыху іншы выгляд. Паранейшаму, з моманту набыцця Ушачамі магдэбургскага права, святы Лаўрэн апякуецца горадам. Нездарма герб горада мае выяву святога на белым полі каля залатой ракі, мабыць, Ушачы.

Непадалёк ад раённага цэнтра ёсць вёскі Селішча і Чарапоўшчына. У першай захаваліся рэшткі касцёла Св. Веранікі і кляштара бернардзінцаў XVIII стагоддзя. Нават у занядбаным выглядзе храм уражвае сваёй веліччу і вышынёю. Кажуць, калісьці ён быў багата ўпрыгожаны разьбою па дрэве і ляпнінай, у яго ж было перавезенае начынне з ушацкага касцёла пасля таго, як апошні закрылі ў 1863 годзе. Аднак сёння селішчанскі касцёл, на жаль, аблюбаваны толькі птушкамі. Блізу вёскі Чарапоўшчына ў пейзажным парку знаходзіцца сядзіба Маліноўскіх. Мясціна маляўнічая, і панскі дом у дастаткова добрым стане. Дзіўна, але на ім нават не вісіць шыльдачка «Ахоўваецца дзяржаваю». А трэба б было, бо ў сядзібе захаваліся незвычайнай прыгажосці драўляныя столі, дзвярныя праёмы, вінтавая лесвіца, шыкоўныя пакоі і нават сутарэнні.

Вядома, што за дзень наведаць гістарычныя мясціны немагчыма, а гэта значыць, што Ушаччына запрасіць нас у госці яшчэ раз. Вяртаючыся назад, мы наведалі мемарыяльны комплекс «Прарыў», які нагадвае пра падзеі яшчэ не такой даўняй, але надта балючай вайны. Сваёй манументальнасцю і сэнсавай напоўненасцю, думаю, «Прарыў» будзе яшчэ доўга ўражваць нашых дзетак і не даваць забываць пра Вялікую Айчынную вайну.

Нашае выхадное падарожжа закончылася на Лепельшчыне, бо вярталіся ў Віцебск менавіта праз яе. Не менш за Ушаччыну яна чаруе роўнаддзямі азёраў і сівой мінуўшчынай. Хочацца тут прыгадаць і вёску Губіна, у якой знаходзяцца рэшткі касцёла Св. Антонія XVIII стагоддзя і Свята-Мікалаеўская царква, якая, на жаль, таксама не дзейнічае. Аднак гэтая вёска, як і многія іншыя ў Беларусі, нагадвае пра нашую канфесійную гісторыю, калі спрадвеку касцёлы і цэрквы ў беларускіх мястэчках будаваліся побач, каб хрысціяне шчыра ўсміхаліся адно аднаму дзеля ўзрастання любові да Бога.

Напрыканцы хочацца падзяліцца назіраннямі за сваімі сябрамі, якія пад час такіх паездак адкрываюць многія мясціны Бацькаўшчыны нанова. У кагосьці адраджаецца, у кагосьці ўзмацняецца любоў да роднага краю. Гэтая любоў сцішана жыве ў нашым сэрцы штодзённа. Але праз сустрэчы з прыродай і сівой мінуўшчынай незвычайна аднаўляецца. І хочацца цалаваць бацькоўскую зямлю, усміхацца сонейку, спяваць песні краявідам і проста радавацца жыццю, як гэта робяць тыя, хто расплюшчыў вочы і... пабываў у гасцях у роднай Беларусі.

*Ірына ЛОБАН,*
*г. Віцебск*

# Кніга пра генія

***З Уладзімірам Ліпскім мне пашчасціла пазнаёміцца яшчэ ў 2007 годзе, а дакладней – у сакавіку, калі з 12 па 14-га ў яго прайшлі сустрэчы ў школах Ліды, а таксама ў маёй вясковай Крупаўскай СШ. Для горада гэтыя дні адметныя тым, што ў 1940 годзе з 13 па 15 сакавіка яго наведаў Янка Купала. Акурат праз 67 гадоў на Лідчыну завітаў даследчык Купалавага радаводу Уладзімір Ліпскі – такое супадзенне. А яшчэ ў 2007 годзе ўсе адзначалі 125-я ўгодкі Янкі Купалы і Якуба Коласа.***

У. Ліпскі не толькі галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка», шмат гадоў узначальваў Беларускі дзіцячы фонд, але і аўтар кніг («Не выжываю, а жыву», «Жыві сёння», «Мы. Аповесць пра нашы прозвішчы», «Мама. Малітвы сына», «Чыстая брахня» я маю ў сваёй бібліятэцы, усе яны перачытаныя мною не адзін раз).

Аднаго разу Уладзімір Сцяпанавіч падзяліўся са мною радасцю, што выйшла яго чарговая кніга «Янкаў вянок», якая мае падзагаловак «Дзецям пра Янку Купалу». Набыўшы яе, гартаю кранальнае выданне. І не проста чытаю, а станаўлюся сведкам. Кніга багата ілюстраваная архіўнымі здымкамі, малюнкамі ды рэпрадукцыямі карцінаў: усё прывабіць вока маленькага чытача.

У кнізе 30 аповедаў, тэматычна злучаных між сабою. А пачынаецца з радаводу Луцэвічаў ад XVII стагоддзя. (Раздзелы пра паходжанне роду, ягоны герб і бацькоў класіка «Краязнаўчая газета» нядаўна друкавала на сваіх старонках. – **Рэд.**)

Далей чытачу прапануюцца расповеды пра Вязынку, пра вандроўку сям'і Луцэвічаў у пошуках лепшага прытулку і заробку, названыя У. Ліпскім «жыццё на калёсах». Цікава апісваецца вучоба Янкі, пачатак літаратурнай дзейнасці і творчае сталенне. У аповедзе «Сустрэча на Нёмане» ідзе гаворка пра сустрэчу двух геніяў – Янкі Купалы і Якуба Коласа – у Мікалаеўшчыне ў 1912 годзе.

Аўтар «Янкавага вянка» не забываецца, што асноўная чытацкая аў-




дыторыя кнігі – дзеці, і для іх ён знаходзіць своеасаблівыя прыцягальныя факты. У адным з аповедаў аўтар піша: "Паэт запрасіў школьнікаў у госці ў сваю хату... Кожнаму вучню Янка Купала падпісаў сваю кніжку. От каб адшукаць тых бабруйскіх шчаслíўцаў ды спытаць, як жа яны пранеслі па жыцці Купалаву дабрыню». Тое ж хацелася б адзначыць і ў адносінах да маіх аднавяскоўцаў з Крупава, якія ў 1940 годзе 14 сакавіка сустракаліся з класікам у Лідзе (дарэчы, гэты факт у кнізе не згадany). Якім ён падаўся і што яны адчувалі?

Жыццё Купалы – своеасаблівая загадка, што патрабуе разгадак фактаў і падзеяў. Частка разгаданая ў гэтай кнізе (хочацца назваць яе дзіцячай энцыклапедыяй). Аўтар пільна падае тыя скалечаныя рэвалюцыяй, вайной і калектывізацыяй падзеі-лёсы, якія не абышлі і нацыянальнага паэта. «Дзякуючы» таму ліхалеццю была спроба самагубства, а пасля – і трагічная смерць у гасцініцы «Масква». Аўтар "Янкавага вянка» піша, што «ніхто пакуль не ведае шчырай праўды. Веру, яе знойдуць нашчадкі Купалы».

Водгук пасля прачытання можна пісаць доўга – як і пра саму творчасць Песняра. Хай бы гэтая кніга дайшла ў кожную школьную бібліятэку, каб дзеці маглі больш даведацца пра беларускага генія.

...Пачатак кнігі – уздых, канец – выдых. Такое пачуццё ўзнікае ад чытання...

«Янкаў вянок» – гэта раскрыццё не толькі жыцця і творчай спадчыны Купалы, але і праўдзівай гісторыі народа – беларусаў.

***Алесь ХІТРУН,***
***студэнт філфака***
***Гродзенскага дзяржаўнага***
***універсітэта імя Янкі Купалы***

# Ці будзе ў мінчукоў яшчэ адно Траецкае прадмесце?

*(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)*

Высветлілася, што гэты раён вызначаўся цэлым кварталам сваёй адметнай архітэктуры. Гэта былі замкнёныя двары з 1–2-павярховымі каменнымі дамамі, асобную катэгорыю стваралі драўляныя гаспадарчыя пабудовы. Аднак збольшага гэты раён быў забудаваны даволі якаснымі мураванымі будынкамі. Адзначым, што да гэтага распрацоўшчыкамі афіцыйнага праекта аднаўлення (пра гэта будзем казаць таксама ніжэй) сцвярджалася, што забудова гэтага раёна мела хаатычны характар і ўяўляла малакаштоўную драўляную архітэктуру, так бы мовіць, ледзь не звычайныя хлявы, якія пастаянна затоплівала сваімі паводкамі р. Свіслач, і таму аднаўленне дадзенага раёна ў першапачатковым выглядзе не мэтазгоднае. Наконт паводкаў Свіслачы – гэта сапраўды так. Аднак на падставе гэтага ўносіць змены і вольнасці ў працэс аднаўлення помнікаў усё роўна не прымальна. Тым больш, калі высвятляецца што гэты раён валодаў сваёй адметнай драўлянай і каменнай архітэктурай, якая сфармавалася на працягу стагоддзяў і практычна ў тым жа выглядзе праіснавала да 1950-х гг.

Пра ўсё гэта сведчыць зробленая на грамадскіх пачатках праца добраахвотных даследчыкаў. Калі імі быў адноўлены выгляд усёй забудовы (адзначым, што гэта тытанічная праца), і ўдзельнікі камісіі ўбачылі створаную 3D мадэль дадзенага раёна, то адразу стала ясна, наколькі якасна быў забудаваны гэты квартал. Нават сам узровень вышыні дамоў вуліцы Гандлёвай быў спраектаваны і забудаваны такім чынам, каб не засланяць, а наадварот, «прыадкрыць» панараму на кафедральны сабор і на іншыя помнікі архітэктуры, на тагачасны цэнтр горада, якім тады была Саборная плошча (сённяшняя пл. Свабоды). Такім чынам, дзякуючы працы ініцыятыўнай групы быў віртуальна адноўлены выгляд будынкаў, змены на працягу часу, прасочаныя перабудовы помнікаў. Пры гэтым дзякуючы зробленай працы паўстаў першасны выгляд раней не вывучанага кутка Мінска.

Што ж можна сказаць пра той праект, які на сённяшні дзень плануюць ажыццявіць у цэнтры горада?

Навукова-праектная дакументацыя па аднаўленні гістарычнай забудовы, што распрацоўваецца па заказе КУП «Мінская спадчына» і плануецца ў хуткім часе ажыццявіцца, мае мала агульнага са справай належнага аднаўлення гістарычнай спадчыны. Гэта можна аднесці і да планіроўкі (практычна ўсе будынкі мяркуецца ўзвесці на іншым месцы), выгляду будынкаў, іх памераў (паводле праекта там ужо пераважаюць 3-павярховыя дамы, не ўласцівыя традыцыі старажытнага дойлідства Мінска). Усё гэта, безумоўна, сапсуе не толькі выгляд на былую Саборную царкву, але і сам раён вул. Гандлёвай будзе зменены да непазнавальнасці.

Чаму так адбываецца, што помнікі архітэктуры аднаўляюцца без уліку сапраўднага іх аблічча і гісторыі іх бытавання? Пакінем гэтае пытанне на думку чытачоў і мажлівую рэакцыю на гэтую публікацыю. Адзначым толькі, што пад час збору ініцыятыўнай групай матэрыялаў пра выгляд забудовы набярэжнай вуліцы Гандлёвай, было высветлена, што некаторымі архіўнымі матэрыяламі да іх фактычна ніхто не карыстаўся. Так сталася, напрыклад, у Беларускім архіве навукова-тэхнічнай дакументацыі, які знаходзіцца ў будынку былога касцёла Св. Язэпа (Іосіфа) у старым горадзе, пра што выразна сведчыць журнал карыстання. У гэтым архіве, дарэчы, былі адшуканыя дакладныя памеры, планы будынкаў, зробленыя яшчэ за савецкім часам, незадоўга перад зносам (у перыяд з 1949 па 1953 гг.), калі планавалася пасляваенная перабудова Мінска. Адметна, што будынкі практычна не пацярпелі ў апошнюю вайну, і зносілі іх з сімвалічнай фармулёўкай: «З прычыны рэканструкцыі», «Знос па кап. рамонце» і г.д.

Цяпер, праз колькі дзясяткаў гадоў, ёсць магчымасць цалкам і ў комплексе зберагчы гэты квартал помнікаў. Дакладней, не зберагчы, а рэканструяваць, рэстаўраваць, аднавіць. Вядома, сітуацыя з тым, што забудова ў гэтым раёне не захавалася, ускладняе справу яе цэласнага аднаўлення. Але і гэта сітуацыя не з'яўляецца невырашальнай. Сусветная практыка ведае прыклады, калі цалкам зруйнаваная архітэктура аднаўлялася праз шмат гадоў. Так сталася з адбудовай Варшавы пасля вайны: жыхары горада аднавілі гістарычны цэнтр. Так сталася і ў Гданьску, дзе практычна ўсе будынкі былі знішчаныя, але затым якасна адбудаваныя, і цяпер нават не даюць наведніку-турысту магчымасці мець сумнівы ў дачыненні да старадаўнасці гэтых гарадоў.

Так можа быць і з Мінскам: праз паўстагоддзе пасля зруйнавання забудовы па вуліцы Гандлёвай мы можам аднавіць гэты гістарычны квартал. Прычым гэта і плануецца рабіць, але планумеая рэканструкцыя, як бачна, мае вялікія пытанні да сваёй адпаведнасці і дакладнасці. Такім чынам, галоўнае на сёння – не згубіць шанец аднаўлення гістарычнага цэнтра.

Назіральная камісія пры Міністэрстве культуры адназначна выказалася «аб непрымальнасці праектных прапановаў КУП «Мінскпраект» па ўзнаўленні гістарычнай забудовы цотнага боку вул. Гандлёвай у межах комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці 1-й катэгорыі “Гістарычны цэнтр Мінска”». Выказаліся і за тое, каб пры распрацоўцы праекта аднаўлення вуліцы Гандлёвай былі ўлічаны матэрыялы і прапановы сяброў ініцыятыўнай групы.



Стары здымак вуліцы Гандлёвай



Унутраная планіроўка двароў

Скончыць артыкул не хацелася б пералікам прадуманых канкрэтных крокаў, неабходных для ажыццяўлення належнага праекта аднаўлення вул. Гандлёвай:

– улічыць прапановы назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры (а гэта значыць адбудова кожнага дома, гаспадарчых значных дапаможных адзінак на месцы тых, што раней існавалі, з тым самым архітэктурным абліччам). Як паказаў прыклад ініцыятыўнай групы, усе матэрыялы для гэтага ёсць. Толькі ў такім выпадку можна казаць пра сапраўднае аднаўленне страчанай архітэктуры;

– адмовіцца ад рэалізацыі раней распрацаванага праекта, які не забяспечвае належнага аднаўлення гістарычных помнікаў (тым больш, што пакуль гэты праект не прайшоў узгадненне ў Міністэрстве культуры). Такім чынам, яшчэ на стадыі падрыхтоўкі можна не дапусціць неадпаведнага падыходу да справы аднаўлення;

– перанесці калектар. Гэта дазволіць аднавіць вуліцу належнай шырыні, а значыць захаваць выгляд і цэласнасць ансамбля;

– забяспечыць якасць правядзення прац (не пабудову так званых навабудаў, а належны працэс аднаўлення з улікам агульнаеўрапейскай практыкі);

– забяспечыць навукова-грамадскі кантроль (у межах той жа камісіі, якая будзе назіраць за ходам правядзення прац па аднаўленні і іх якасці).



Від на Набярэжную паводле 3D мадэлі

У Мінску ёсць шмат праблемных пытанняў з рознымі помнікамі архітэктуры. Асабліва гэта датычна гістарычнага цэнтра. Гэта і размяшчэнне ў кляштары бернадзінцаў гатэля, і неабходнасць вынасу з касцёла Св. Язэпа размешчанага там архіва, гэта і плануемае ўзвядзенне хмарачоса каля музея Вялікай Айчыннай вайны на Кастрычніцкай плошчы (апошняе цалкам зменіць выгляд на Стары горад). Усяму гэтаму варта надаваць цэласную і асобную ўвагу па кожным праекце, пры гэтым не дапусціўшы змянення гістарычнай забудовы Мінска, што і так неаднаразова рабілася нашымі папярэднікамі. Аднак будзем спадзявацца, што агульнымі намаганнямі ў нас зможа паўстаць яшчэ адзін з нешматлікіх якасна адбудаваных кавалачкаў старога Мінска. Яшчэ адно Траецкае прадмесце. Толькі колькі такіх прадмесцяў мы мелі насамрэч?

*Павел КАРАЛЁЎ,*
***намеснік старшыні Беларускага камітэта ІКАМОС, сябра Рады Беларускага фонду культуры***

## Калекцыянерам, і не толькі

### Жывёлы і расліны нашай планеты

Яшчэ ў снежні 2006 года Генеральная Асамблея ААН у мэтах прыцягнення большай міжнароднай увагі да праблемы страты біялагічнай разнастайнасці, што працягваецца і цяпер, абвясціла 2010 год Міжнародным годам біяразнастайнасці. Для яго правядзення ў нашай краіне Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя распрацавала спецыяльны план мерапрыемстваў: адукацыйныя акцыі і семінары, фота- і кніжныя выстаўкі, конкурсы і фестывалі, прыродаахоўныя канферэнцыі і форумы, паказы дакументальных фільмаў і сацыяльных відэаролікаў.

Выдавецкі цэнтр «Марка» выпусціў у абарот паштовы **блок № 76**, прысвечаны Міжнароднаму году біяразнастайнасці, з **маркамі №№ 824–826**. Выпуск намалявала Марыя Плахатнюк, памеры марак – 37х26 мм, блока – 132х49 мм, агоны наклад – 25 тысячаў асобнікаў.

У дзень выпуску на паштамце Мінска праводзілася спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень» (мастак М. Плахатнюк).




### На ваду!

Выйшлі маркі з серыі «Спартыўныя яхты». На мініяцюры **№ 829** адлюстравана яхта класа «Аптыміст», **№ 830** – яхта класа «Прамень». Іх намаляваў Яўген Сіманенка, памер – 28х40 мм, друкаваліся ў малых аркушах па 7 марак і 1 купоне. Наклад марак – 42 тысячы асобнікаў.

У дзень выхаду у абарачэнне на паштамце Мінска праводзілася спецгашэнне на канверце «Першы дзень» (мастак Я. Сіманенка).

Варта дадаць, што існуе спартыўная класіфікацыя







яхтаў, якая вызначае падзел на класы. Гэта неабходна, каб стварыць роўныя ўмовы спартыўнай барацьбы. Маленькім шверботам-адзіночкам «Аптыміст» могуць кіраваць дзеці. Нацыянальны клас «Прамень» – спартыўны парусны швербот-адзіночка з'яўляецца копіяй міжнароднага класа «Лазер».

***Вялікі дзякуй за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялаў рубрыкі супрацоўнікам выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта»***

## Увага, грыбнікі!

Вялікую небяспеку тояць дары лесу – грыбы. Часам людзі не ўмеюць адрозніваць ядомыя і атрутныя грыбы, не звяртаюць увагі на асноўныя правілы перапрацоўкі і гатавання грыбоў, а таксама ўжываюць грыбы, сабраныя на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях. У Беларусі адзначаюцца выпадкі атручвання бледнай паганкай, якая нагадвае лісічку, сыраежку ці шампіньён, жоўцевым грыбом, падобным на белы, несапраўднымі апенькамі, смаржкамі, часам мухаморам.

Забываюць людзі і на тое, што нельга захоўваць грыбы ў сырым выглядзе, бо нават у халадзільніку яны могуць знаходзіцца не больш за 2–3 дні. Пры гатаванні грыбы трэба адварваць не менш за два разы прыкладна па 50 хвілінаў. Калі вы будзеце выконваць гэтыя правілы, то захаваеце сваё здароўе.

Даўрачэбная дапамога пры атручванні грыбамі:

1) выклікаць урача;

2) прамыць страўнік: выпіць 5–6 стаканаў вады, каб выклікаць ірвоту, паўтарыць працэдуру 3–5 разоў;

3) бесперапынна даваць хвораму цёплае піцво, а пры рэзкай слабасці – моцны чай;

4) калі няма рэдкага стулу, то толькі ў першыя гадзіны пасля атручэння грыбамі хвораму можна даць лёгкі слабіцельны сродак (1 сталовая лыжка вазеліну ці касторавага алею).

***Вольга ЦЫНКЕВІЧ,***
***інспектар ЦРАНС***

## Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 25

**Уздоўж**. **1**. Калодзеж. **4**. Капуснік. **9**. Арда.. **10**. Іван. **11**. «Купалінка». **14**. Возера. **15**. Век. **16**. Кравец. **19**. Кашпо. **20**. Свята. **23**. Уцякач. **25**. Юга. **27**. Абцугі. **29**. Ачышчэнне. **31**. Чары. **32**. Свет. **33**. Кікімары. **34**. Старонка.

**Упоперак**. **1**. Красавік. **2**. Лада. **3**. Засуха. **5**. Пракоп. **6**. Нівы. **7**. Канфіцюр. **8**. Зелле. **12**. Верашчака. **13**. Вадзяніцы. **17**. Ноч. **18**. Аса. **21**. Дружочак. **22**. Дзіцятка. **24**. Чучала. **26**. Гучок. **27**. Арніка. **28**. Крук. **30**. Звон.

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

**(Пачатак у № 1 за 2003 год)**

**КОЛА** – сіло для лоўлі курапатак; ляшчынавы абруч (дыяметрам 1–1,5 м), зацягнуты сеткай з тонкага моцнага шнура, да якой прывязвалі некалькі дзесяткаў петляў з конскага воласу. Лавілі ім пераважна ўзімку, калі мароз і біскорміца «гналі» курапатак да чалавечага жытла. Кола клалі на прытоптаны снег на загуменні ці ў садзе каля кустоў, прысыпалі для маскіроўкі і прываблівання птушак сенам і мякінай. Разграбаючы пацяруху, курапаткі самі сабе зашморгвалі петлі на лапках.



*1 – агульны выгляд;*
*2 – валасяная пятля*

**«КОЛА»** – традыцыйны танец. Называўся таксама «Кружкі», «Кругавая», «Круток». Музычны памер $^1/_4$. Тэмп хуткі. Галоўная асаблівасць яго – рух па крузе і ўсялякія кружэнні. Пад рознымі назвамі пашыраны па ўсёй Беларусі. Р. Друцкі-Падбярэскі апісаў «Кругавую» ў працы «Беларускае вяселле» // Ілюстрацыя. 1848. Т. 6. Пра «Кружкі» як пра галоўны танец на беларускіх святочных вечарынках паведамляў М. Дзмітрыеў: ад васьмі да шаснаццаці выканаўцаў кружацца ў ім парамі пад музыку і спевы розных кароценькіх прыпевак (Дзмітрыеў М. Збор песень, казак, абрадаў і звычаяў сялянаў Паўночна-Заходняга краю. Вільня, 1869). «Круціха», што выконвалася на вясellях, згадвае С. Сахараў. «Круган», што выконваўся двума мужчынамі, зафіксаваны на Брэстчыне, «Круглы» – на Магілёўшчыне.



*Сцэнічны варыянт танца выконвае фальклорны калектыў «Унукі»*

**КОЛЕСНЯ** – прыстасаванне для вырабу драўляных колаў; неабходная прылада стальмашнай майстэрні. Называлася таксама калесня. Уяўляла сабой масіўны ўслон з акруглай адтулінай пасярэдзіне, падоўжанай з аднаго боку скразной шчылінай. Форма адтуліны і прыстасаваны вертыкальна рычаг-клямар давалі магчымасць заціскаць у калодку кола, нацягваць обад на спіцы, забіваць утулку, буксу і інш.





**КОМІН** – дымаход у печы. Комінам называўся таксама ганчарны выраб, які выкарыстоўвалі ў верхняй частцы дымахода (у паўдн.-зах. раёнах яго называлі ладыш). Уяўляў сабою высокі цыліндр дыяметрам 25–30 см, даўжынёю 80–100 см. Да апальвання ў горне яго манціравалі з дзвюх нарыхтовак даўжынёю 40–50 см кожная. У наш час для гэтага выкарыстоўваюцца бляшаныя і азбацэментавыя трубы.

**КОНАЎКА** (ад нямецкага Kanne польскае konew – збан, кружка) – невялікая драўляная, радзей металічная або ганчарная пасудзіна з ручкай. Звычайна мела конусападобную форму. У паўсядзённым побыце служыла для зачэрпвання і пералівання вадкасцяў. Выкарыстоўвалася таксама як кубак для піцва, тады мела больш падоўжаную форму, звычайна цыліндрычную.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 15 мая 2009 г.
Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры», вытворчае прыватнае унітарнае прадпрыемства «Светач», Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамасны – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Андрэй Вірчак, Анатоль Грыцкевіч, Алесь Карлюкевіч, Лідзія Кулажанка, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Віталь Скалабан, Віктар Хурсік.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Камунальная набярэжная, 6.
Тэл. 283 28 26, 334 61 62.
Тэл./факс 334-42-03
E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае.
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 15.07.2010.
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14).
Ліцэнзія ЛП № 02330/0150475 ад 25.02.2009.

Заказ 697.
Тыраж 1080 асобнікаў.